«Сказания о смерти князя Олега» и поэтический перевод одного из самых известных фрагментов «Слова о полку Игореве» – «Плача Ярославны».

Развивать интеллектуальные способности учащихся, не затрагивая эмоциональной сферы, невозможно. Поэтому, проводя в рамках ***проекта «Созвучье муз»*** различные конкурсы, музыкально-литературные вечера, композиции, поэтические турниры и викторины, нам важно было пропустить через детей не только информацию о гениальных поэтах, художниках, композиторах, но и определенные эмоции.

Один из литературных турниров этого проекта посвящен музыкальной теме. Учащиеся создают собственные стихотворные и прозаические произведения, получая творческий импульс, источником которого служит музыка.

В рамках проекта «Созвучье муз» дети также участвовали в театрализованном вечере «Ночь перед дуэлью», в конкурсах исполнительского мастерства «Осенние зарисовки», «Мелодия четырнадцати строк», «Зима в лирике русских поэтов 19–20 веков», в конкурсе инсценировок «И снова – «Ревизор!», в литературной гостиной «Сонеты Уильяма Шекспира», в поэтических вечерах, посвященных творчеству А. Пушкина, М. Цветаевой, В. Высоцкого, С. Островово.

«Прекрасных женщин имена» – литературный конкурс, в котором участникам Пушкинского клуба в качестве объектов поэтического вдохновения были предложены шедевры мировой живописи, по преимуществу – разновидности женского портрета.

Впечатление, владевшее мастерами живописи при создании художественных полотен, было прочувствовано и нашими юными авторами и – преломленное сквозь магический кристалл искусства – стало основой их собственных поэтических вдохновений.

Цель ***проекта «Первые пробы пера»*** состоит в создании условий для выявления в Пушкинском клубе новых одаренностей, новых поэтов, обладающих своим голосом, своей творческой манерой, своим видением мира.

В рамках этого проекта проводятся турниры поэтов, поэтические гостиные, организуются встречи с русскоязычными поэтами и писателями Беларуси, посещаются лекционные и интерактивные занятия Государственного Музея-заповедника А.С. Пушкина «Михайловское», издаются сборники творческих работ учащихся гимназии.

Таким образом, Пушкинский клуб сплотил детей вокруг общей идеи – популяризации русской классической литературы XIX века как источника духовно-нравственного богатства, как платформы для проявления инициативы и творчества, что является непременным условием инкультурации развивающейся личности.

---

1. Распутин, В. Жертвовать собою для правды. Против беспамятства / В. Распутин // Наш современник. – 1988. – № 1. – С. 169–176.

## ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ НАВУЧЭНЦАЎ СРОДКАМІ СВЯТОЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**Шык К. І.**
*выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (г. Мінск)*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Анатацыя.*** *Дадзены артыкул прысвечаны актуальнай тэме: патрыятычнаму выхаванню маладога пакалення. Улічваючы той фактар, што пытанні патрыятычнага выхавання моладзі сродкамі святочнай дзейнасці даследаваны недастаткова, у артыкуле былі вызначаны метады выкарыстання святочнай дзейнасці ў патрыятычным выхаванні, разгледжаны механізмы і асаблівасці ўздзеяння гэтых метадаў і сродкаў на моладзь як у цэлым, так і асобна.*

***Summary.*** *This article is devoted to an actual topic: patriotic education of the younger generation. Taking into account the fact that the issues of patriotic education of youth by means of festive activities is not enough, the use of festive activities in patriotic education was determined in this article, the mechanisms and characteristics of the effects of these methods and tools on young people as a whole or separately were examined.*

Патрыятызм з’яўляецца адным з важнейшых складнікаў светапогляду кожнай асобы і адлюстроўваецца ў ідэалогіі кожнай дзяржавы. Ідэалогія – гэта сукупнасць ідэй, канцэпцый, праграм, каштоўнасцей, норм па прынцыповых праблемах развіцця свайго краю і краіны ў цэлым. Ідэалогія цесна звязана з карэннымі інтарэсамі грамадзян, палітыкай і штодзённай грамадскай практыкай. Патрыятызм як якасць асобы чалавека выяўляецца ў любові да сваёй Радзімы, імкненні самаахвярна служыць свайму народу, захоўваць яго мову, культурную і гістарычную спадчыну, звычаі і традыцыі.

Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, якія адбываюцца ў сучасным грамадстве, абумовілі змяненні ў сацыякультурным жыцці, паўплывалі на пераацэнку каштоўнасцей у свядомасці навучэнцаў і абумовілі стварэнне новых падыходаў да патрыятычнага выхавання, якое ў сучасных умовах набывае адмысловую актуальнасць і значнасць, бо мае вялікае значэнне ў сацыяльным, духоўным, маральным развіцці асобы.

У цяперашні час традыцыйныя формы патрыятычнага выхавання не заўсёды спрацоўваюць. Таму паўстала неабходнасць выпрацоўкі новых формаў і метадаў патрыятычнага выхавання навучэнцаў, улічваючы разнастайнасць інтарэсаў маладога пакалення і магчымасцяў вольнага часу, у якім моладзь можа развівацца ў двух напрамках: па-першае, як – будучае краіны, на што ўплывае адпачынкавая дзейнасць як спосаб самараскрыцця, самаўдасканалення, самарэалізацыі асобы, а па-другое, як – пакаленне без перспектывы, у сувязі з шэрагам негатыўных тэндэнцый у сферы вольнага часу, звязаных з узнікненнем настрояў бессэнсоўнасці існавання, тусовак без мэты і сэнсу, выкарыстання вольнага часу толькі для ўвесялення і забавы, крыміналізацыяй дасуга, якая праяўляецца ў росце маладзёжнай злачыннасці, алкагалізме, наркаманіі і інш. Эфектыўным сродкам рашэння вызначаных праблем можа стаць святочная дзейнасць з яе адмысловымі магчымасцямі ўздзеяння на асобу.

Праблемамі патрыятычнага выхавання займаліся многія даследчыкі: А.А. Аронаў, В.В. Буткевіч, А.Н. Выршчакаў, М.Б. Кусмарцаў, Л.Л. Ражкова, А.А. Грымаць, М.А. Дзегцярова, В.В. Чэчат, С.Д. Лапцёнак, М.У. Леснічэнка-Рагоўская і іншыя. Сацыяльны аспект патрыятычнага выхавання вывучаўся Н.К. Крупскай, А.С. Макарэнка, У.С. Салаўёвым, І.М. Андраманавай, Т.С. Базаравай, Г.П. Каваленка. Многія навукоўцы аналізавалі і іншыя актуальныя бакі патрыятычнага выхавання.

Аднак мэтанакіравана патрыятычнае выхаванне ў працэсе святочнай дзейнасці, амаль не зацікавіла даследчыкаў. Яго закраналі В.В. Буткевіч, С.С. Кацэвіч, Т.І. Касімава, А.Л. Барчук і некаторыя іншыя навукоўцы ў кантэксце агульнага патрыятычнага выхавання ў межах школы, як адну з формаў работы з навучэнцамі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навукоўцы Л.А. Кудрашова, С.В. Пятрова, В.П. Канаш, А.М. Русецкая, Н.Н. Дымава распрацавалі комплекс мерапрыемстваў і свят патрыятычнай накіраванасці ў дапамогу педагогу. Тым не менш, амаль немагчыма назваць даследчыкаў, у працах якіх патрыятычнае выхаванне ў працэсе святочнай дзейнасці разглядалася б асобна і грунтоўна.

Нягледзячы на ўзрастаючы інтарэс да тэмы патрыятычнага выхавання, цесная ўзаемасувязь свят і іх роля ў фарміраванні патрыятызму навучэнцаў яшчэ нядосыць ацэненая і вывучаная ў сучаснай навуцы. Не да канца выяўлены і вызначаны маральны патэнцыял, які ў іх змяшчаецца, а таксама не даследавана іх роля ў фарміраванні патрыятызму навучэнцаў.

У выніку вывучэння праблемы былі выяўленыя супярэчнасці паміж наяўнасцю багатага выхаваўчага патэнцыялу свят у фарміраванні патрыятычных пачуццяў навучэнцаў і недастатковым іх выкарыстаннем у структуры патрыятычнага выхавання; значным патэнцыялам святочнай дзейнасці ў патрыятычным выхаванні і нераспрацаванасцю арганізацыйна-педагагічных падыходаў да яе выкарыстання; паміж неабходнасцю рэалізацыі задач выхавання навучэнцаў у працэсе святочнай дзейнасці і непадрыхтаванасцю спецыялістаў: педагогаў, рэжысёраў, культарганізатараў да іх вырашэння.

Адзначым, што навучэнцы – гэта моладзь ад 16 да прыкладна 21 года, якая навучаецца ў сярэдніх, сярэдня-спецыяльных і вышэйшых навучальных установах. Гэта, першым чынам, час засваення абранай прафесіі, вызначэння стаўлення да грамадскага жыцця і да сваёй ролі ў ім, узрост, калі чалавек больш меней трывала сцвярджаецца ў сталым жыцці. Маладосці ўласцівы аптымізм. Чалавек прыступае да рэалізацыі сваёй жыццёвай задумы, ён поўны сіл і энергіі, жадае ажыццявіць свае мэты і ідэалы. Гэта якраз той узрост, у якім фарміруецца асоба і ўсталёўваецца светапогляд, у якім патрыятычнае выхаванне здольнае ажыццявіць стратэгічны пералом, закласці фундаментальныя духоўныя ісціны на будучыню. Т.А. Васількова адзначае: «Дадзеная ўзроставая катэгорыя характарызуецца свядомым улікам навучэнцам ролі знешніх умоваў і яго асабістых высілкаў у фарміраванні якасцей асобы» [1, с. 50]. У гэтым узросце фарміруюцца перадумовы для развіцця цэласнай пазітыўнай ідэнтычнасці, крышталізацыя якой звязаная з пошукам, асэнсаваннем і сцвярджэннем персанальнай пазіцыі па стаўленні да значных сфер жыцця ў даляглядзе будучыні. Пераважна ва ўзросце ад 16 да 21 года ўзнікае пытанне асэнсаванага выбару жыццёвых каштоўнасцей. Таму вельмі важна павысіць ролю патрыятычнага выхавання, якое здольнае дапамагчы маладым людзям вызначыць як жыць.

Такім чынам, дадзены ўзрост – гэта ўзрост фарміравання светапогляду, станаўлення асобы, пашырэння і паглыблення інтарэсаў навучэнцаў. У гэты час адбываецца станаўленне прафесійных інтарэсаў, таму ў іх вельмі хутка развіваюцца розныя захапленні ў вольны час. Фарміраванне асобы ў гэтым узросце абавязкова павінна спалучацца з дзейнасцю ўстаноў культуры і адукацыі, дзе педагог, рэжысёр, культарганізатар выступае пасрэднікам паміж навучэнцамі і асяроддзем, накіроўвае і дапамагае зрабіць ім правільны выбар.

Аднак дзейнасць педагога ў дадзенай сітуацыі мае шэраг асаблівасцяў, і асноўнай з'яўляецца тая, што выхаваўчая работа заўсёды выбіраецца самім навучэнцам і вядзецца ў вольны час. Варта сказаць, што пад вольным часам мы разумеем той час, які застаецца ў чалавека пасля яго асноўнай дзейнасці, у прыватнасці ў навучэнцаў, пасля заняткаў у навучальных установах і ўсіх працэсаў, з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

імі звязаных: падрыхтоўкі хатніх заданняў, чытання дадатковай літаратуры і г.д., прычым у структуры вольнага часу можна вылучыць актыўную творчую дзейнасць, культурнае спажыванне (чытанне газет, наведванне кіно, прагляд тэлевізара і г.д.), самаадукацыю, спорт, розныя віды хобі і г.д. Вольны час можа быць як дзейсным, так і пасіўным, карысным і шкодным, у залежнасці ад таго, праводзіць малады чалавек яго дома альбо па за яго межамі, нічога не робіць, проста адпачывае альбо зацікаўлены пошукам карыснай інфармацыі, наведвае розныя гурткі, аб'яднанні альбо «тусуецца», бо вольны час – гэта выбар, які заснаваны не толькі на ўласных традыцыях, густах і перавагах, але і на распаўсюджаных тэндэнцыях, модзе [3, с. 238].

У нашай краіне праводзяцца святы рознай накіраванасці, што абумоўлена сацыяльна-эканамічнымі працэсамі, якія адбываюцца ў сучасным грамадстве. З упэўненасцю можна сказаць, што сёння ў арганізацыі святочнай дзейнасці аднаўляецца гістарычная пераемнасць народнай культуры на глебе рэгіянальных традыцый. Арганізатары сацыяльна-культурнай дзейнасці, рэжысёры, педагогі непасрэдна абапіраюцца на ўсё карыснае, што ёсць у актыве народных традыцый. Ва ўстановах культуры праводзяцца ўсе асноўныя святы каляндарнага цыклу. З мэтай шырокай прапаганды захавання і развіцця сямейных народных традыцый ладзяцца шматлікія фестывалі, конкурсы, высілкамі ўстаноў культуры адбываецца прыцягненне дзяцей і моладзі да сферы традыцыйнай культуры, народнай творчасці, падтрымліваюцца фальклорныя рухі. Традыцыйнымі ўжо сталі ваенна-патрыятычныя фестывалі і конкурсы, мерапрыемствы, прысвечаныя памяці вайны ў Афганістане, перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне і інш. Асабліваe месца ў святочным жыцці сталі займаюць мясцовыя фестывалі мастацкай самадзейнасці, гульнёвых праграм, эстраднага вакальнага і харэаграфічнага мастацтава і інш.

Адзначым, што святочная дзейнасць – гэта шматгранны творчы працэс і вынік працы рэжысёраў, культарганізатараў, педагогаў і іншых творчых асоб, накіраваны на дасягненне пэўных выхаваўчых, эстэтычных, маральных, адпачынкавых і іншых мэтаў, якія ўвасоблены арганізатарамі ў форме ўрачыстасці альбо сукупнасці звычаяў, абрадава-рытуальных, відовішчных ці масава-гульнёвых дзей, у якіх могуць спалучацца ўсе віды і жанры мастацтва [2, с. 14].

Адной з пераваг святочнай дзейнасці клубных устаноў, з'яўляецца іх патэнцыйная максімальная даступнасць для самых розных груп насельніцтва, у тым ліку і навучэнцаў, незалежна ад матэрыяльнага і сацыяльнага становішча, адукацыйнага ўзроўня, здольнасцяў і г.д.

Праблема фарміравання і рэалізацыі педагагічнага патэнцыялу клубных устаноў залежыць ад больш поўнага і якаснага выкарыстання святочнай дзейнасці ў выхаваўчым працэсе. Рэалізацыя педагагічнага патэнцыялу святочнай дзейнасці не павінна насіць чыста фармальны характар. Колькасны рост святаў нельга разглядаць як перадумову якасных змен у развіцці асобы, бо гэта залежыць ад якасці стварэння свят, якая і вызначае змяненне магчымасцяў педагагічнага патэнцыялу і характар яго рэалізацыі.

Даследаванне паказала, што неабходна пераасэнсаванне святочнай дзейнасці ў рэальнай практыцы работы клубных устаноў. Цэнтруючы сваю ўвагу пераважна на канцэртах, дыскатэках, камерцыйных святах, работнікі культуры значна звужаюць выхаваўчы патэнцыял клубных устаноў і святочнай дзейнасці. Адпаведна патэнцыйна клубныя ўстановы з'яўляюцца інавацыйнымі і эксперыментальнымі пляцоўкамі для самых розных формаў і тэхналогій рэжысёрскага мастацтва, што таксама з'яўляецца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складаючай часткай іх выхаваўчага патэнцыялу.

Аднак нягледзячы на існаванне шматлікіх добрых святочных мерапрыемстваў, адбываецца засілле нізкапробных узораў масавай культуры і выцясненне якасных узораў айчынных і замежных свят. Гэта прыводзіць да маральнай дэградацыі, страты ўласнай культурнай ідэнтычнасці, прымітывізацыі сацыяльных і культурных запытаў маладых людзей і грамадства. Акрамя гэтага, скажоная сучасная інтэрпрэтацыя розных духоўных святаў, такіх як Дзень ўсіх святых, які атрымаў назву Хэлуін, сёння суправаджаецца пераапрананнем у персанажаў нячыстай сілы і мерцвякоў, запальваннем злавесных свяцілень, што з'яўляецца сапраўдным акультызмам, які зусім процілеглы евангельскім прынцыпам. Таксама камерцыялізацыя і традыцыя грамадскага святкавання Дня святога Валянціна не маюць нічога агульнага з сапраўдным яго зместам [4, с. 28]. Усе гэтыя скажоныя спосабы адзначэння вышэйзгаданых святаў зусім не адпавядаюць хрысціянскім, бо падмяняюць сапраўдныя хрысціянскія каштоўнасці чалавечымі прыхільнасцямі, што адмоўна ўплывае на моладзь. Не ўсе святы спрыяюць патрыятычнаму выхаванню, педагогамі і рэжысёрамі не заўсёды выкарыстоўваюцца вялізарныя выхаваўчыя магчымасці святочнай дзейнасці.

Эфектыўнасць святочнай дзейнасці ў патрыятычным выхаванні навучэнцаў патрабуе ўключэння яе ўдзельнікаў у актыўны творчы рух, арыентацыю на духоўныя каштоўнасці і іх узнаўленне, на захаванне нацыянальнай культуры, беларускай мовы.

Аналіз спецыяльнай літаратуры сведчыць аб тым, што праблема патрыятычнага выхавання навучэнцаў з'яўляецца найбольш важнай на сучасным этапе развіцця грамадства. Паспяховае развіццё любой краіны, немагчыма, калі сістэма фарміравання і развіцця падрастаючага пакалення будзе пазбаўленая духоўна-маральных асноў, асабліва любові да сваёй Айчыны.

Рэжысёрам, педагогам, культарганізатарам, кіраўнікам сацыяльна-культурных і адуацыйных устаноў варта звярнуць увагу на метады выкарыстання святочнай дзейнасці ў патрыятычным выхаванні, механізмы і асаблівасці ўздзеяння гэтых метадаў і сродкаў на моладзь як у цэлым, так і асобна.

На аснове праведзенага аналізу ўсталяваныя спецыфічныя асаблівасці творчага працэсу па арганізацыі свята, якія ўплываць на кагнітыўны, эмацыйна-пачуццёвы і дзейнасны кампаненты структуры асобы. Пры гэтым святочная дзейнасць выступае як адмысловая форма культурна-духоўнага пераўтварэння ўдзельніка свята, якая спрыяе актывізацыі сацыяльна-асобасных якасцяў, развіццю крэатыўнага мыслення, эмацыйна-вобразнага, пачуццёвага ўспрымання рэчаіснасці, вызначальных арыентацый, самавызначэнню і самаразвіццю культуратворчай асобы патрыёта.

Тэарэтыка-практычнае асэнсаванне спецыфічных сродкаў святочнай дзейнасці дазволіла структураваць мадэль выхавання патрыятызму, якая ўключае педагагічныя ўмовы, прынцыпы, мэты і задачы, этапы, змест і метады вучэбна-творчага працэсу.

Для эфектыўнага выкарыстання спецыфічных сродкаў святочнай дзейнасці, былі вызначаныя педагагічныя ўмовы выхавання патрыятызму: эмацыйна-вобразнае засваенне зместу патрыятызму, фарміраванне асабістай пазіцыі навучэнца як актыўнага суб’екта жыццядзейнасці і культуратворчага працэсу.

Трэба адзначыць, што не кожны арганізатар здольны данесці дух патрыятызму ў тую ці іншую святочную праграму. Таму варта акрэсліць якасці спецыяліста, які займаецца патрыятычным выхаваннем. Самай важнай рысай такой асобы вызначаецца патрыятызм, бо выхоўваць патрыётаў, годных грамадзянаў, высокакваліфікаваных спецыялістаў, носьбітаў нацыянальнай культуры можа толькі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чалавек з высокімі маральнымі якасцямі, патрыёт з усвядомленым грамадзянскім абавязкам, які павінен мець адмыслоўную ўсталёўку на патрыятычную дзейнасць і псіхалагічную гатоўнасць да яе. Сярод асноўных якасцяў павінны быць таксама самакрытычнасць і патрэба ў пастаянным самаўдасканаленні, дысцыплінаванасць і высокая патрабавальнасць да сябе.

Акрамя патрабаванняў да асобы арганізатара, варта ўлічыць наступныя рэкамендацыі пры падрыхтоўцы свят:

- змест кожнага свята і падрыхтоўкі да яго, павінен спрыяць выхаванню патрыятызму;
- усе арганізацыйныя пытанні па падрыхтоўцы да правядзення свята павінны быць загадзя абмеркаваны;
- дзейнасць моладзі ў працэсе падрыхтоўкі і правядзення свята павінна быць усвядомленай. Толькі пры гэтай умове можна стварыць неабходныя матывы дзейнасці і, адпаведна, дасягнуць станоўчых вынікаў;
- вялікую ўвагу трэба надаваць зместу сцэнарыя свята, які будзе спрыяць выхаванню патрыятызму;
- неабходна добра прадумваць спалучэнне на святе розных відаў мастацтва;
- святы павінны ўзбагачаць жыццё моладзі радаснымі перажываннямі, развіваць ініцыятыву і самастойнасць;
- у працэсе падрыхтоўкі і падчас свята неабходна развіваць творчую актыўнасць моладзі, іх пазнавальныя працэсы;
- пасля правядзення свята важна замацаваць атрыманыя маладымі людзьмі ўражанні і веды. Для гэтага трэба праводзіць гутаркі, круглыя сталы, дыскусіі і інш.
- падчас падрыхтоўкі і правядзення свята неабходна выразная, узаемазлучаная работа педагогаў, рэжысёраў, культарганізатараў па магчымасці, бацькоў і, вядома, моладзі. Толькі пры гэтай умове свята пройдзе паспяхова і пакіне яркія ўспаміны ва ўсіх яго ўдзельнікаў.

---


1. Василькова, Т. А. Социальная педагогика : учеб. пособие / Т. А. Василькова. – М. : КНОРУС, 2010. – 240 с.
2. Шык, К. І. Выкарыстанне святочнай дзейнасці ў выхаваннні навучэнцаў ва ўстановах клубнага тыпу / К. І. Шык // Сацыяльна-педагагічная работа – 2012. – № 7. – С. 13–17.
3. Шык, К. І. Вольны час і асаблівасці яго выкарыстання навучэнцамі ў сучаснай сацыякультурнай сітуацыі / К. І. Шык // Сучасны культурны працэс: праблемы, перспектывы, метады даследавання : XXXVII навук. канф. студ., магістр. і асп. БДУКМ (г. Мінск, 18-19 крас. 2012 г.) : зб. навук. арт. / рэдсавет: М. А. Мажэйка (старш.) [і інш.] ; Мінск : БДУКМ, 2012. – С. 237–242.
4. Шык, К. І. Роля хрысціянскіх святаў у патрыятычным выхаванні моладзі / К. І. Шык // Христианские ценности в культуре современной молодежи : матер. II Респ. науч. конф. (г. Мінск, 13 дек. 2013 г.) / ГУО «Институт теологии имени святых Мефодия и Кирилла» Белорус. гос. ун-та / сост. М. А. Можейко, Е. Ю. Шимбалева. – Минск : Ковчег, 2014. – С. 26–30.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ